# З Ашмян на вяселле ў сталіцу: незабыўная паездка пажылых людзей на “Шчодрыцу”



Наведвальнікі аддзялення дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту Цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ашмянскага раёна атрымалі ўнікальную магчымасць – яны наведалі ў сталіцы музычна-інтэрактыўны спектакль “Вяселле са Шчодрыцай” у выкананні заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь народнага ансамбля народнай песні і танца “Шчодрыца”. Падзея адбылася ў ДУ “Мінскканцэрт”, дзе пануе асаблівая творчая атмасфера.

З першых акордаў і спеваў на роднай мове зал акунуўся ў атмасферу сапраўднага свята. Артысты не проста ігралі ролі – яны стварылі жывое дзейства, куды запрасілі і саміх гледачоў, якія сталі непасрэднымі ўдзельнікамі вясельнага абраду. Разам з акцёрамі госці падпявалі задорныя песні, танцавалі, успамінаючы сваю маладосць. Хтосьці нават адважыўся выйсці на сцэну павіншаваць “маладых” – усё як на сапраўдным вяселлі, толькі на сцэне Мінска. Кожны адчуў сябе не проста госцем, а часткаю вялікай і дружнай сям’і, дзе шануюць традыцыі.



У вачах людзей свяціліся шчасце і ўдзячнасць. Гэта была не проста сустрэча з мастацтвам – гэта было вяртанне да вытокаў, да самых цёплых і сардэчных старонак жыцця. “Шчодрыца” падаравала сапраўдны цуд: злучыла пакаленні, напоўніла сэрцы радасцю і нагадала, наколькі багатая і прыгожая наша культура.

Ашмянцы вярталіся дадому з цёплымі ўспамінамі і жаданнем зноў сустрэцца з народным калектывам.

